УДК 009(476)

## Дзейнасць Міністэрства беларускіх спраў у 1918-1924 гг.

Багалейша С.В.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

Адной малавядомай старонкай ў гісторыі Беларусі навейшага часу з’яўляецца дзейнасць Міністэрства беларускіх спраў пры літоўскім урадзе ў 1918-1924 гг. Утварэнню і дзейнасці Міністэрства беларускіх спраў нацыянальныя дзеячы ў свой час надавалі важную ролю. Яны спадзяваліся з яго дапамогай пашырыць самасвядомасць і арганізаванасць беларускае грамадства, ускладалі на яго надзеі ў адраджэнні беларускай дзяржаўнасці.

У дзейнасці Міністэрства беларускіх спраў можна выдзеліць чатыры перыяды, абумоўленыя палітычнымі абставінам:

1) Снежань 1918 – красавік 1919 г.: арганізацыйны, накіраваны на арганізацыю беларускай справы на Гродзеншчыне; 2) Май 1919 – ліпень 1920 г.: звужэнне дзейнасці ў сувязі з пагаршэннем беларуска-літоўскіх узаемаадносін і складанай міжнароднай сітуацыяй; 3) Жнівень 1920 – люты 1922 г.: адзін з найбольш плённых перыядаў у дзейнасці Міністэрства; 4) Сакавік 1922 – студзень 1924 г.: статус Міністэрства беларускіх спраў рэзка змяніўся. Яго роля ў жыцці беларускага грамадства рэзка знізілася, і ў рэшце рэшт 20 студзеня 1924 г. яно спыніла сваю дзейнасць.

Міністэрства беларускіх спраў было створана згодна з дагаворам паміж урадам БНР і літоўскай Тарыбай ад 27 лістапада 1918 г, калі ў яе склад увайшлі 6 сяброў Віленскай Беларускай Рады: В. Ластоўскі, І. Луцкевіч, Я. Станкевіч, В. Талочка, К. Фалькевіч і Д. Сямашка. Яго ўзначаліў Я. Воронка, а з чэрвеня 1920 г. Д. Сямашка. Згодна з Часовым палажэннем аб Міністэрстве беларускіх спраў літоўскага ўрада яно мела на мэце прадстаўляць і абараняць інтарэсы беларусаў, якія жывуць на беларускай, а таксама літоўскай этнічнай тэрыторыі. Гэта каля 39 тыс. км кв., з насельніцтвам больш за 1,9 млн. чалавек. Тэрыторыя павінна была мець статус аўтаномнай адзінкі з дзяржаўнай беларускай мовай. Гэта землі былой Гродзенскай, паўднёвай часткі Віленскай (Лідскі, Ашмянскі і Віленскі паветы) і Аўгустоўскі павет Сувалкаўскай губерні.

Міністэрства распрацоўвала ўстанаўленне аўтаномнага ўпраўлення ў беларускай частцы Літвы, а таксама законапраекты і падавала іх на разгляд Тарыбы. Яно адыграла значную ролю ў павышэнні нацыянальнай свядомасці сярод беларускага грамадства, яго культурна-адукацыйнага ўзроўню. Яно вяло актыўную культурна-асветніцкую, ваенную і дыпламатычную дзейнасць, якая знаходзіла адпаведную рэакцыю сярод краін, якія прымалі ўдзел у вырашэнні беларускага пытання.